# «И всякому человеку потребна чести, понеже ест зерцало жития нашего»

**Як на полымя, на віруючую ці спакойную раку ды на нястомныя аблокі ў высокім небе, гэтак жа бясконца доўга можна глядзець на старажытныя рукапісы, першыя друкаваныя выданні і ўнікальныя экзэмпляры кніг, якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Калекцыя рукапісаў, старадрукаў і рэдкіх кніг бібліятэкі – больш за 90 тысяч адзінак. Цалкам асвоіць гэты магутны пласт культурна-гістарычнай спадчыны наўрад ці рэальна для звычайнага наведвальніка. І ўсё ж адкрыць для сябе сакрэты кніжнага скарбу магчыма кожнаму, хто пабывае ў Музеі кнігі, створаным у Нацыянальнай бібліятэцы.**
**Нагодай для наведвання карэспандэнтам святая святых Нацыянальнай бібліятэкі стала 500-годдзе выхаду ў свет першай беларускай друкаванай кнігі. З гэтай тэмы, зразумела, і пачала аповед Таццяна САПЕГА – загадчык сектара навукова-праектнай работы навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі:**

– Юбілей, які адзначаецца сёлета, – 500-годдзе беларускага кнігадрукавання – узняў хвалю вялікай зацікаўленасці шырокай грамадскасці да кніжнай культуры, асэнсавання феномена Францыска Скарыны і яго кніжнай спадчыны. Беларусы ведаюць дакладную дату выдання першай друкаванай кнігі – 6 жніўня 1517 года. Гэтую дату Ф. Скарына пазначыў у пасляслоўі да «Псалтыра», які з'яўляецца першай кнігай, выдадзенай асветнікам у Празе. Кожны наведвальнік Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі можа першадрукі ўбачыць на ўласныя вочы ў Музеі кнігі. Сёння ў бібліятэцы захоўваюцца 10 кніг беларускага першадрукара. Выдадзены яны ў Празе ў 1517–1518 гадах.

**– Ці ёсць магчымасць кнігі Скарыны не толькі паглядзець, але і пачытаць?**

– Думаю, што адной з найлепшых кніг для знаёмства з тэкстамі першадрукара з'яўляецца факсімільнае выданне «Кніжная спадчына Францыска Скарыны». У ім упершыню сабраны поўны рэестр кніг, што былі надрукаваны Францыскам Скарынам у Празе (1517–1519) і Вільні (1522–1525). Важна, што кожная з кніг выдадзена ў суправаджэнні навуковых артыкулаў, а таксама з перакладамі прадмоў і пасляслоўяў Скарыны на сучасныя беларускую, рускую і англійскую мовы. Асноўнымі ініцыятарамі і выканаўцамі выдавецкага праекта сталі Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Банк БелВЭБ. Ён рэалізаваны дзякуючы супрацоўніцтву з замежнымі бібліятэкамі і музеямі, у зборах якіх захоўваюцца выданні беларускага першадрукара. У аснову пакладзены электронныя копіі кніг Скарыны, што зараз знаходзяцца ў бібліятэках і музеях Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі і іншых краін. Факсімільнае выданне «Кніжная

▼ Кніга «Прамудрасць Божая» Францыска Скарыны (1518) у экспазіцыі Музея кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. 2017 год



спадчына Францыска Скарыны» стала безумоўным пераможцам прэстыжнага нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі – 2017» і атрымала Гран-пры ў намінацыі «Трыумф». Выданне з'яўляецца базавай крыніцай для навуковых даследаванняў, а таксама адрасавана ўсім, хто цікавіцца сваёй гісторыяй і культурай. Цяпер яго можна ўбачыць у Нацыянальнай бібліятэцы і шматлікіх бібліятэках краіны. Дзякуючы гэтаму выдавецкаму праекту шырокая грамадскасць мае магчымасць далучыцца да каштоўнага пласта нашай культурнай спадчыны.

**– Наколькі я разумею, ваша штодзённая праца звязана з вывучэннем кніжных помнікаў, такіх, напрыклад, як арыгіналы кніг Францыска Скарыны. Ці ёсць усведамленне таго, што экзэмпляр, які знаходзіцца зараз у вас у руках, вялікая каштоўнасць, ці адчуваеце хваляванне?**

– Навукова-даследчая дзейнасць у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прадугледжвае працу менавіта з арыгіналамі. Падчас апісання і даследавання кніг, стварэння музейных экспазіцый, мы, безумоўна, усведамляем і добра разумеем, з якім каштоўным аб'ектам працуем. Аднак казаць, што знаходзімся пастаянна ў стане ўзнёсласці, канешне, было б перабольшаннем. Тым не менш юбілейная дата ўзрушыла і нас як прафесіяналаў. Асэнсаванне велічы гэтай падзеі для беларускай гісторыі і культуры, для беларускага народа, яе значнасці для сучаснікаў надае нам стымул працягваць штодзённую нялёгкую, але надзвычай цікавую працу па даследаванні рукапіснай кнігі, кніжнай спадчыны славутага першадрукара і яго паслядоўнікаў.

**– Цікава, колькі ўсяго кніг Францыск Скарына пакінуў нашчадкам?**

– Скарынаўская кніжная спадчына ўключае: 23 кнігі Старога Запавету, выдадзеныя ў Празе ў 1517–1519 гадах, а таксама «Малую падарожную кніжку» (каля 1522) і «Апостал» (1525), выдадзеныя ў Вільні. У свеце выяўлена больш за 500 друкаваных экзэмпляраў, якія захоўваюцца ў дзяржаўных і прыватных зборах Беларусі, Вялікабрытаніі, Германіі, Даніі, Літвы, Польшчы, Расіі, Славеніі, ЗША, Украіны, Чэхіі. Большасць выданняў нашага першадрукара цяпер знаходзяцца ў Расіі. Нацыянальная бібліятэка Беларусі захоўвае пражскія выданні Ф. Скарыны. Летась у Беларусь вярнулася «Малая падарожная кніжка», якую Белгазпрамбанк набыў для ўласнай калекцыі.



▲ Музейныя заняткі ў рамках праекта «У госці да кніг» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. 2017 год

**– Таццяна Андрэеўна, раскажыце, калі ласка, які алгарытм паступлення каштоўных выданняў у фонд вашай бібліятэкі?**



– Пошукі і папаўненне калекцыі Нацыянальнай бібліятэкі кніжнымі помнікамі – гэта адзін з прыярытэтных напрамкаў працы нашай установы. Летась за кошт бюджэтных сродкаў неацэнная калекцыя папоўнілася 86 дакументамі. Набываюцца кнігі таксама дзякуючы спонсарскай падтрымцы. Адным з яркіх прыкладаў з'яўляецца набыццё выданняў Казіміра Семяновіча XVII стагоддзя. Дарэчы, да нядаўняга часу ў сховішчах Беларусі не было ніводнага асобніка знакамітага земляка, а ў 2012 годзе фонд Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі папоўніўся яго кнігай «Вялікае мастацтва артылерыі» 1650 года выдання. Наш суайчыннік К. Семяновіч лічыцца адным з заснавальнікаў сусветнай ракетнай балістыкі і касманаўтыкі. На працягу стагоддзяў яго трактат «Вялікае мастацтва артылерыі» з'яўляўся не толькі адной з найважнейшых у Еўропе навуковых прац, але і адным з найбольш запатрабаваных падручнікаў па артылерыі. Першае выданне было надрукавана палацінску ў Амстэрдаме (1650), а пазней кніга была перакладзена на шматлікія нацыянальныя мовы. У Музеі кнігі экспануюцца чатыры выданні: на лацінскай, французскай, нямецкай і англійскай мовах, набытыя дзякуючы спонсарам бібліятэкі.

**– Напэўна, у бібліятэкі ёсць юбілейныя праекты, адрасаваныя юным чытачам?**

– Безумоўна, мы не маглі абысці ўвагай такую важную сацыяльную групу, як дзеці. Менавіта з дзіцячага ўзросту неабходна пачынаць ствараць устойлівы падмурак, на якім грунтуецца разуменне каштоўнасці кніжнай спадчыны, яе ролі ў гісторыі і ў сучасным жыцці.

Значным юбілейным праектам для дзяцей з'яўляецца трохтомная энцыклапедыя «Францыск Скарына» – вынік сумеснай работы намесніка дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алеся Сушы і калектыву выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі». Тры тамы беларускай дзіцячай энцыклапеды на аснове найноўшых навуковых даследаванняў і найбагацейшага ілюстрацыйнага матэрыялу прадстаўляюць жыццёвы шлях і спадчыну першадрукара. Кнігі «Францыск Скарына – чалавек-энцыклапедыя», «Францыск Скарына – чалавек свету», «Францыск Скарына – чалавек-легенда» з дапамогай яркіх вобразаў раскрываюць веліч асобы беларускага асветніка не толькі дзецям, але і іх бацькам.

У Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ўжо другі год запар ажыццяўляецца культурна-асветніцкі праект «У госці да кніг» праз правядзенне музейных заняткаў для дзяцей. Заняткі накіраваны на развіццё цікавасці да кнігі і фарміраванне гонару за багатыя традыцыі айчыннай кніжнай культуры. Яны праводзяцца з выкарыстаннем актыўных і інтэрактыўных методык і такім чынам ператвараюцца ў займальную гутарку, у якой кожны ўдзельнік вядзе жывую размову. Прапануўаем дзецям вясёлыя творчыя заданні і гульні. Хлопчыкі і дзяўчынкі, напрыклад, самі становяцца музейнымі экскурсаводамі і даследчыкамі кнігі, спрабуюць сябе ў якасці перапісчыкаў і ствараюць свае ўнікальныя ініцыялы.

У рамках праекта юныя ўдзельнікі шмат даведваюцца пра жыццё і дзейнасць Ф. Скарыны і нават ствараюць дызайнерскія партрэты першадрукара, складаюць скарынаўскі тытульны аркуш з пазлаў і г.д. Асноўная наша мэта не толькі адкрыць для хлопчыкаў і дзяўчынак пэўныя навуковыя факты, але найперш абудзіць жаданне чытаць і самім дазнавацца пра новае. Магу з задавальненнем адзначыць, што дзіцячы праект «У госці да кніг» атрымаў станоўчыя водгукі ўдзельнікаў, іх бацькоў і настаўнікаў.

**– Ці чакае наведвальнікаў бібліятэкі ў юбілейны Скарынаўскі год яшчэ штосьці новае і адметнае?**

– У бібліятэцы адбудуцца шматлікія значныя юбілейныя мерапрыемствы, сярод іх – маштабны выставачны праект «Францыск Скарына і яго эпоха». Выстаўка, якая мае міжнародны фармат, адкрыецца 14 верасня і будзе дзейнічаць да канца 2017 года. На ёй упершыню прэзентуюць кнігі Ф. Скарыны і іншых еўрапейскіх друкароў з некалькіх краін свету.

**Гутарыла Таццяна КОНЮХ**